Такім чынам, Музей гісторыі горада Мінска развіваецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснага грамадства і актуальнымі тэндэнцыямі ў музеялогіі. Дзейнасць па музеефікацыі аб’ектаў Верхняга горада накіравана на ўсебаковае вывучэнне гісторыі музеефікаваных аб’ектаў з мэтай наступнага стварэння адпаведных экспазіцый і распрацоўкі культурна-асветніцкіх праграм, накіраваных на актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны горада Мінска.

1. *Дзянісаў, А. М.* Мінскі кляштар бернардзінцаў / А. М. Дзянісаў // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 209.

2. Минская городская управа // Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 1. Оп. 1. Л. 5.

## ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ СУЧАСНЫХ ФОРМ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

***А. Я. Камінскі,***
*дацэнт, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

У адпаведнасці з «Тэматычным планам навукова-даследчых работ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў на 2016–2020 гг.» на кафедры рэжысуры абрадаў і свят вядзецца тэарэтычная распрацоўка праблемы тыпалогіі мастацкіх форм гарадской святочнай культуры. Супрацоўнікі кафедры арыентуюцца на вывучэнне цэлага спектру праблем, звязаных з гістарыяграфіяй, акрэсленнем традыцый народнага мастацтва ў кантэксце сучаснай святочнай культуры, апісаннем спецыфікі абрадавых і тэатралізаваных форм.

Канцэптуальнае асэнсаванне гарадской святочнай культуры Беларусі з улікам гістарычнага кантэксту і дынамікі змяненняў яе традыцый і мастацкіх форм з’яўляецца надзвычай актуальным, бо ў сучаснай навуцы гэты сегмент народнай культуры асэнсаваны пакуль толькі ў асобных аспектах. Працэсы глабалізацыі, што імкліва нарастаюць у свеце ў XX – пачатку XXI ст.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабуюць інавацыйных падыходаў і асаблівай увагі да захавання шматвяковых духоўных арыенціраў нацыянальных культур.

Істотным фактарам сучасных працэсаў у культуры з'яўляецца пашырэнне і развіццё сфер гарадскога жыцця. У кантэксце гэтага актуальным з'яўляецца паняцце «ўрбаністыка», якое ўключае ў сябе шэраг міждысцыплінарных падыходаў па горадазнаўстве і гарадской святочнай культуры. У плане гістарыяграфіі ўрбаністыку ўтварае корпус тэкстаў, прысвечаных гораду як сацыяльнаму і культурнаму феномену, функцыянаванню гарадоў, жыццядзейнасці і культуры гараджан. Вобраз горада ствараецца не толькі сродкамі навукі (гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, геаграфіі, эканомікі, культуралогіі), але і сродкамі мастацтва. Толькі ў выніку супольных намаганняў навукоўцаў і практыкаў у сферы культуры феномен гарадской культуры можа быць спасцігнуты і інтэрпрэтаваны ў разнастайных сучасных формах.

Сёння гарадская *святочная культура* – гэта частка духоўнай народнай культуры, шматузроўневая сістэма святочных традыцый, звычаяў, абрадаў, цырымоній, якія адлюстроўваюць працоўную дзейнасць чалавека і бытавыя норавы соцыуму ў яго гістарычным развіцці. *Традыцыя* – гэта генетычная памяць нацыянальнай культуры кожнага народа, якая ахоплівае вялікае кола з'яў і праяўленняў, характэрных для ўсіх сфер сацыяльнага жыцця. Традыцыя разглядаецца як механізм перадачы сацыяльна значнага вопыту індывідуума або калектыву ад пакалення да пакалення.

У сучаснай святочнай практыцы адбываецца працэс рэанімацыі, рэстаўрацыі і трансфармацыі рэшткаў культурнай спадчыны розных гістарычных напластаванняў, якія здольныя інтэграваць паміж сабой, пераўтвараючыся ў навацыйныя элементы традыцыі і культурнага фонду нацыі. Але згодна тэорыі вечнага руху прыроды і грамадства любая навацыя абавязкова мадыфікуецца ў традыцыю.

Чалавек, які нарадзіўся і жыў у арэоле бытавання традыцыйных архаічных форм культуры, цалкам падпарадкоўваўся яе нормам і законам, пачынаючы ад глабальна-абстрактных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(усведамленне агульнай карціны свету, погляды на рэлігію, тэорыю нараджэння і знікнення суб’ектаў сусвету), заканчваючы канкрэтнымі бытавымі правіламі штодзённага апранання, харчавання, працы, святкавання і інш.

У архаічным абшчынна-вясковым соцыуме традыцыя існавала як працяглая ўстойліва-нязменная і недатыкальная форма быцця, своеасаблівая сістэма каштоўнасцей з міфічнай першаасновай. «Фальклор, – піша Б. Н. Пуцілаў, – гэта мноства ведаў, уменняў, майстэрства, навыкаў і практыкі мінулага <...> ён бясконца разнастайны, неўвядальны, жывы і рухомы, заўсёды гатовы ахапіць і асіміляваць новыя элементы і ў той жа час які страчвае свае пазіцыі пад уздзеяннем сучаснага прагрэсу і індустрыі, фальклор выступае прыроджаным апанентам усякай штампоўкі, патэнтаванага стандарту» [1]. Дасягнуўшы пэўнага ўзроўню самасвядомасці, традыцыя прымала рацыянальны характар і ўспрымалася як звычай або норма. «На стадыі ўзнікнення і першапачатковага існавання народная святочная традыцыя, – адзначае К. В. Чыстоў, – заўсёды прасякнута сакральнасцю і непарушальнасцю, дзейнічае пастулат яе вечнасці, неўміручасці. Але непрыметна для чалавека яна пастаянна ўдакладняецца і з цягам часу пераўтвараецца ў эпізадычны сегмент трансфармаванага свята» [2, с. 147].

Традыцыя як феномен вызначаецца катэгорыяй агульнага – комплексам элементаў і з’яў, якія аб’ядноўваюць народ. Адначасова агульнае можа існаваць як асобнае, уласцівае толькі пэўнаму этнасу, рэгіёну, мясцовасці, здольнае вылучаць дадзеную групу сярод іншых. Аб’яднанне элементаў культуры асобных локусаў у адну схему ўспрымаецца як агульнанацыянальная традыцыя, якая з цягам часу пры захаванні знешняй формы страчвае свой першапачатковы змест, аўтэнтычнасць.

У кантэксце даследавання мастацкіх форм гарадской святочнай культуры на пачатковым этапе разглядаецца такая форма, як стылізаваны абрад, які валодае вялікім выхаваўчым, культурным, мастацкім, арганізацыйным, забаўляльным, відовішчным патэнцыялам. Дачыненне гледача да міфапаэтычнай энергіі абрадавых дзей спалучае мінулае і сучаснае, магічнае і мастацкае, калектыўнае і індывідуальнае. Пагранічнасць стыліза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі прад'яўляе асаблівыя патрабаванні да прафесійных кампетэнцый і творчай гатоўнасці сучаснага рэжысёра і акцёра-выканаўцы.

Для канцэптуальнага і метадалагічнага абгрунтавання спецыфікі абрадавых і тэатралізаваных форм сучаснай святочнай культуры неабходна сёння апісаць крыніцы, якія дазваляюць даследаваць вызначанае праблемнае поле, акрэсліць традыцыі народнага мастацтва ў кантэксце сучаснай святочнай культуры, вызначыць спецыфіку стылізацыі абрадавых форм святочнай культуры і рэцэпцыю песенна-музычнага фальклору ў сучасным свяце, даследаваць тыпалогію тэатралізаваных форм святочнай культуры.


1. *Путилов, Б. Н.* Фольклор и народная культура [Электронный ресурс] / Б. Н. Путилов // Гуманитарные науки. – Режим доступа: http://www.studmed.ru/view/putilov-bn-folklor-i-narodnaya-kultura_07b4625e7c0.html. – Дата доступа: 29.03.2017.

2. *Чистов, К. В.* Фольклор. Текст. Традиция / К. В. Чистов. – М. : ОГИ, 2005. – 270 с.


## ПРИНЦИПЫ ФОРМИРОВАНИЯ СИНЕСТЕТИЧЕСКИХ КОДОВ В СОВРЕМЕННОЙ ХОРЕОГРАФИИ


***Н. В. Карчевская,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*декан факультета традиционной*
*белорусской культуры и современного искусства Белорусского*
*государственного университета культуры и искусств*


Наиболее существенной характерной особенностью развития современного хореографического искусства является трансформация традиционных форм внутривидовых взаимодействий (в единой композиционной структуре хореографического произведения), а также расширение спектра межвидовых контактов хореографии и других искусств. Однако смысл и своеобразие современной хореографии, ее специфика, возникающая и формирующаяся в системе техногенной цивилиза-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ